# ТВОРЧУЮ ЭНЕРГІЮ ІТР— НА СКЛАДАНЬНЕ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

## (З прамовы т. Галадзеда на IV усебеларускім зьезьдзе ІТР)



Таварышы, дазвольце мне ад імя ЦК КП(б)Б і СНК БССР перадаць зьезду інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў шчырае бальшавіцкае прывітаньне. (Воплескі).

Тав. Казімірчык сказаў, што з часу 3-га да 4-га зьезду прайшлі амаль тры гады. За гэты час наша Савецкая краіна прайшла вялікі шлях соцыялістычнага росту, многа мы маем дасягненьняў. Рабочай клясай праароблена вялікая праца па соцыялістычнай перабудове нашай краіны пролетарскай дыктатуры. Разам з рабочаю клясай пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі інжынэрна-тэхнічныя работнікі таксама многа працавалі на тэхнічнай рэконструкцыі народнай гаспадаркі.

Вам на зьезьдзе па справаздачы БелМБІТ'у трэба добра праверыць, што за гэты час зроблена вашымі кіруючымі профсаюзнымі органамі для таго, каб шляхам разьвіцьця грамадзкай работы сярод навуковых, інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў прыцягнуць усе дзеючыя сілы нашай рэспублікі да ажыцьцяўленьня вялікіх задач соцыялістычнай будоўлі.

Вам трэба шырока разгарнуць крытыку і самакрытыку работы вашых выбарчых органаў.

Палепшыць работу, павысіць яе тэмпы і якасьць—гэта адна з самых актуальных задач, якая стаіць перад кожным з нас, перад партыйнымі, савецкімі і профсаюзнымі работнікамі, а таксама і перад усімі інжынэрамі, тэхнікамі і спэцыялістымі ўсіх спэцыяльнасьцяй.

На падставе посьпехаў першай пяцігодкі мы можам разгарнуць яшчэ больш грандыёзныя пляны ў другой пяцігодцы, а гэтыя пляны павінны быць гіганцкімі, вялікімі як у галіне разьвіцьця экономікі, так і ў галіне разьвіцьця культуры і тэхнікі.

Вынікі выкананьня прамфінпляну першага кварталу паказалі, што некаторыя галіны прамысловасьці не справіліся з ускладзенымі на іх задачамі.

Задача зьезду заключаецца ў тым, каб мобілізаваць усю пролетарскую грамадзкасьць, усіх спэцыялістых, усю рабочую клясу, на тое, каб нам у другім квартале перакрыць недабор першага кварталу па выкананьню прамфінпляну. Гэта нам трэба выканаць, гэта ўзмацніць далейшую індустрыялізацыю краіны і наогул экономічную магутнасьць нашай дзяржавы, гэта зьвязана з палепшаньнем матар'яльнага забясьпечаньня рабочае клясы і працоўнага сялянства. Вашаму зьезду трэба намеціць цэлы рад такіх практычных мерапрыемстваў, якія-б не на словах, а на справе дапамаглі яшчэ больш арганізаваць усю рабочую клясу БССР, дапамаглі мобілізаваць усю савецкую пролетарскую грамадзкасьць на бальшавіцкае выкананьне ўсяго прамфінпляну 1932 г.

Вы таксама будзеце абгаварваць пытаньне аб складаньні другой пяцігодкі і аб удзеле інжынэрна-тэхнічных сіл у гэтым складаньні. Гэта задача па складаньню другой пяцігодкі—гістарычна важная задача, яна патрабуе мобілізацыі ўсіх жывых дзеючых сіл нашай пролетарскай дзяржавы.

Галоўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі вызначана, як гэта запісана ў пастановах 17 партконфэрэнцыі, ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і кляс наогул, зьнішчэньне прычын, што параджаюць клясавыя розьні і эксплёатацыю. Перавыхаваньне людзей у актыўных і сьвядомых будаўнікоў соцыялізму, організацыя бяскласавай соцыялістычнай грамады.

Галоўным экономічным лёзунгам на другое пяцігодзьдзе зьяўляецца лёзунг завяршэньня тэхнічнай рэконструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі (транспорту, прамысловасьці і сельскай гаспадаркі). У завяршэньні соцыялістычнай і тэхнічнай рэконструкцыі народнай гаспадаркі вялізарнейшую ролю павінны адыграць інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі. Галоўнае месца ў гэтай рэконструкцыі павінна заняць машыннае будаўніцтва і электрыфікацыя, як неад'емныя і галоўныя элемэнты тэхнічнай рэконструкцыі.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі Беларусі і СНК БССР, разглядаючы асноўныя ўстаноўкі складаньня другой пяцігодкі ў БССР, выходзячы з генэральнай устаноўкі ўсесаюзнай комуністычнай партыі, якая адбіта ў пастановах 17 партконфэрэнцыі, вызначылі цэлы рад конкрэтных проблем на другую пяцігодку па разьвіцьцю народнай гаспадаркі і культуры БССР.

Галоўны ўпор пры распрацоўцы другой пяцігодкі мы павінны зрабіць на мобілізацыю мясцовых рэсурсаў сыравіны і энэргетыкі. Калі з гэтага пункту погляду падыйсьці да задач, якія стаяць перад намі пры распрацоўцы другой пяцігодкі, гэта азначае, што прад'яўляем адпаведныя патрабаваньні і да спэцыялістых БССР у галіне неабходнасьці актывізацыі іх работы па выяўленьню сыравінных і энэргетычных рэсурсаў Савецкай Беларускай Рэспублікі.

Таму мы ў дырэктыўных устаноўках ЦК КП(б)Б і СНК БССР зрабілі ўпор на разьвіцьцё тарфянай прамысловасьці, пры чым ня толькі як прамысловасьці, якая павінна папаўняць паліўны баланс і замяніць дарагое паліва (дровы), а таксама прывознае паліва і вугаль. Торф павінен служыць ня толькі для паліва, а стаць і шырокай сыравіннай базай для разгортваньня паасобных важнейшых прамысловых прадпрыемстваў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы